# ВЕРНАСЦЬ

*Удаве камандзіра Савецкай Арміі*
*Марыі Мікітаўне Сапранюк*

Пра тэта ведаў толькі
Бог,
Як ты чакала Перамогі.
І як маліла ўсе
дарогі
Вярнуць яго на свой
парог.
Пра гэта ведаў толькі
Бог.
Яшчэ — маленькія дачушкі.
Душылася слязьмі
ў падушку
І лёс маліла, каб збярог.
Ды не пачуў малітвы Бог.
У дваццаць сем ужо ўдава...
Навошта словы суцяшэння,
Жанок вясковых
галашэнне?
Пакрыта срэбрам галава.
У дваццаць сем ужо ўдава
. ...Чарнела сонца
ў вышыні,
І сохлі мальвы каля хаты.
Дамоў вярталіся
салдаты,
А ты не бачыла
вясны:
Магутны Бог,
яго вярні!

І з той пары
да гэтых дзён
Пранесла вернасць
у расстанні,

Святое, чыстае каханне,

Як дзіўны і чароўны сон.

І войнам жудасным праклён.

# САЛДАТЫ БРЭСТА

Пасля вайны прайшло
нямала год.
На целе ўжо даўно залечаныя
раны,
Вось толькі сэрца не загоіць
мой народ,
І плачуць, голавы схіліўшы,
ветераны,
Стук метранома ў гулкай
цішыні.
А мне здаецца —
сэрцаў палымяных...
Пранізваюць душу да глыбіні
Усім памятныя словы
Левітана.
Па закліку святога абавязку
Усталі ў поўны рост
салдаты Брэста.
Для нас наказ — прастрэленыя
каскі,
Радкі крывёй напісанага
тэксту.
Нам да світання б толькі
прастаяць...
«Да, помощь будет. Не могли нас
бросить!»
А смага пачынае дапякаць,
«Піць...» — дзеці і параненыя
просяць.
Абпалены, сцякаючы крывёю,
Баец да Мухаўца хацеў
прабрацца.
Ды выпаў лёс адважнаму
герою
Навечна тут скульптураю
застацца.
Мемарыял на месцы тых баёў.
З усіх куткоў сюды
прыходзяць людзі,
Каб пакланіцца мужнасці
сыноў,
Сказаць, што мы ніколі
не забудзем.
Не маем права мы
нікога з іх забыць.
Свяціць нам так, каб і за іх
свяціла.
Стагоддзі гэта крэпасць
будзе жыць —

Людскога духу і адвагі сіла!
...Пасля вайны прайшло
нямала год,
Ды кроплямі крыві на брэсцкіх
ружах росы.
Сыноў з вайны чакае
мой народ
І плачуць беларускія бярозы.

Па праву жывога : кніга-прызнанне сучасных
беларускіх паэтаў да 70-годдзя вызвалення
Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў /
склад. Т. Ф. Рослік. — Мінск, 2014. — С. 296—298.